


# ЯК ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ УДЗЕЛ І ЎПЛЫЎ БЕЛАРУСКІХ ЖАНЧЫН У ПАЛІТЫЦЫ?

## *НЕ КВОТАМІ АДЗІНЫМІ*

Вера Моніна, Вікторыя Смаляк,
Аляксей Пятрэнка

Кейс-клуб 2024 | Good governance

# УСТУП

Гендарная роўнасць – важная каштоўнасць для дэмакратычнага свету. Беларусь, якая з’яўляецца часткай Еўропы, не павінна быць выключэннем. Як неаднаразова падкрэслівалі беларускія дэмакратычныя сілы, яны імкнуцца да еўрапейскай будучыні нашай краіны. Гэта азначае, што Беларусь павінна падзяляць каштоўнасці гендарнай роўнасці. Больш за тое, забеспячэнне гендарнай роўнасці з’яўляецца адной з мэтаў устойлівага развіцця, прынятых Арганізацыяй Аб’яднаных Нацый.

Нягледзячы на адносна высокую 41-ю пазіцыю Беларусі ў The Global Gender Gap Index 2023, у краіне назіраюцца праблемы з дасягненнем гендарнай роўнасці, асабліва ў палітыцы. Так, у беларускім Савеце міністраў зараз толькі адна жанчына. Аляксандр Лукашэнка публічна заяўляе, што Канстытуцыя Беларусі “напісаная не пад жанчыну”, а грамадства не саспела для таго, каб галасаваць за жанчыну. Самая заўважная палітычная актарка нашай краіны – галава Савета Рэспублікі Наталля Качанава, якая магла бы служыць пазітыўным прыкладам беларускім жанчынам, цалкам падтрымлівае тэзіс пра тое, што Беларуссю мае кіраваць мужчына. Па стане на 2021-ы год толькі 4 са 114 кіраўнікоў раёнаў – жанчыны.

# ГЕНДАРНАЯ НЯРОЎНАСЦЬ – ПРАБЛЕМА ПА АБОДВА БАКІ БЕЛАРУСКАЙ МЯЖЫ

Варта адзначыць, што недастатковае разуменне важнасці гендарнай роўнасці існуе не толькі ў палітыцы афіцыйнага Мінска. Сёлета ў лютым беларускія медыі і актывісты абмяркоўвалі праект выбарчай сістэмы ў Каардынацыйную Раду, і тэмай спрэчак сталі менавіта гендарныя квоты. Напрыклад, экс-палітвязень і блогер Сяргей Пятрухін у інтэрв'ю прызнаўся: "Я іх не ведаю, чаму яны кажуць ад майго імя – я не разумею. Яны падымаюць гендарныя пытанні. Гэта выглядае ў маім разуменні распілоўваннем грошай". Былы рэдактар рэсурсу NEXTA Ян Рудзік назваў сітуацыю "дурдомам" і абурыўся, што з-за гендарных квот у склад КР могуць не трапіць "матываваныя мужыкі". На яго думку, увядзенне гендарных квот на ўзроўні 40% – "штучнае стварэнне праблемы на роўным месцы і ўзняцце парога ўваходжання". Крытыкі квот выказваліся аб тым, што "ствараць асобную позву, каб наўпрост кабеты далучаліся да нас, лічым абсалютна бессэнсоўным" – то бок прызналі, што не бачаць патрэбным стварэнне інфраструктуры для прыцягнення жанчын у палітыку. Асацыяцыя гендарных квот з "распілоўваннем", "праблемамі на роўным месцы" і публічныя выказванні супраць квот паказваюць, што беларусы і беларускі не разумеюць важнасці гендарнай роўнасці і кватавання як аднаго з інструментаў яе дасягнення.

Калі мы паглядзім на грамадскую думку, то негатыўная рэакцыя на прапанаваныя гендарныя квоты выглядае заканамерна. Даныя даследавання фемгрупы КР, якое правялі ў 2023-ым годзе сярод насельніцтва гарадоў, паказваюць, што толькі 12% беларусаў і беларусак лічаць праблему гендарнай няроўнасці актуальнай. У тым жа даследаванні адзначаецца, што ў свядомасці грамадскасці ўсё яшчэ пашыраныя ўяўленні пра дом і сям'ю як галоўны клопат жанчын: так думаюць 66% мужчынаў і 41% жанчын, 59% апытаных пагадзіліся з тым, што мужчыны ў якасці палітычных лідараў лепшыя за жанчын (World Values Survey, 2020). Варта дадаць, што згодна з даследаваннем у 2020-ым годзе для прадстаўніцтва ААН у РБ гендарная роўнасць з'яўляецца найменш актуальнай мэтай устойлівага развіцця ААН у вачах беларускіх грамадзян.

Мы лічым, што рэзкі ўвод гендарных квот быў неабачлівым крокам, які справакаваў неразуменне і хвалю абмеркаванняў гендарнай роўнасці ў негатыўным ключы. Выправіць гэту сітуацыю маглі б падрыхтоўка грамадства і разгляд гендарнай роўнасці ў доўгатэрміновай перспектыве. Замест часовага захаду, якім з'яўляюцца квоты, мы прапануем шэраг больш устойлівых рашэнняў.

# ЯК “ПРАДАЦЬ” ГЕНДАРНУЮ РОЎНАСЦЬ

На нашу думку, каб папулярызаваць ідэі гендарнай роўнасці ў палітыцы сярод праактыўнай часткі беларускага грамадства, варта выкарыстоўваць не толькі каштоўнасныя аргументы. Так, вялікі патэнцыял маюць падыходы, звязаныя з эканомікай. У даследаванні беларускіх кампаній ад BEROC заўважана пазітыўная сувязь паміж гендарным балансам у карпаратыўным кіраванні і фінансавымі паказнікамі ў выпадку, калі жанчыны займаць кіроўныя пазіцыі ў кампаніях. Згодна з даследаваннем, якое правёў U4 Anti-Corruption Resource Centre, наяўнасць жанчын у прадстаўнічых органах зніжае карупцыю: не толькі таму, што жанчыны менш карумпаваныя, а яшчэ і з-за больш верагоднага прасоўвання імі, а не мужчынамі, палітычных рашэнняў для змяншэння карупцыі. Гэтыя фактары падкрэсліваюць не толькі каштоўнаснае значэнне гендарнай роўнасці, але і яе значнасць для эканамічнага прагрэсу краіны.

Апроч эканамічных выгадаў далучэнне жанчын да працэсаў полісімэйкінгу можа прынесці пазітыўныя сацыяльныя змены. Даследаванні паказваюць, што жанчыны часцей прымаюць законы, якія тычацца адукацыі, аховы здароўя і абароны дзяцей. Таксама жанчыны-заканадаўцы часцей звяртаюць увагу на рэформу працоўнага заканадаўства і эканамічныя правы.

# ЯК ПРЫНЕСЦІ ЗМЕНЫ?

Мы лічым, што для дасягнення мэтаў, звязаных з прадстаўленасцю жанчын у палітыцы, недастаткова проста ўвесці гендарныя квоты і пачаць набіраць кандыдатак ва ўмовах абмежаванага часу, – варта заняцца падрыхтоўкай кадраў. З дапамогай доўгатэрміновых адукацыйных праграм, стыпендый і стажыровак для жанчын, зацікаўленых у тым, каб браць удзел у палітыцы ці кіраванні, мы зможам падрыхтаваць і кадравы рэзерв, і больш прагрэсіўна настроенае беларускае грамадства. Пасля такіх праграмаў палітыкесы змогуць стаць ролевымі мадэлямі і лідаркамі думкі, змогуць далей трансляваць каштоўнасці роўнасці і заахвочваць большую колькасць дзяўчат ісці ў палітыку. Больш за тое, гэтыя жанчыны могуць у тым ці іншым выглядзе ўдзельнічаць у палітыцы іншых краін, дзе яны цяпер жывуць (напрыклад, у Польшчы), і адвакатаваць інтарэсы беларусаў ці іншых супольнасцяў там. Пасля зменаў у Беларусі выпускніцы падобных праграмаў будуць гатовыя заняць кіроўныя пасады.

Адзін з прыярытэтаў Аб’яднанага пераходнага кабінета – падрыхтоўка кадравага рэзерву, які пасля транзіту ўлады зможа перабудоўваць палітычную сістэму ў Беларусі. Для гэтага прадстаўнік па транзіце ўлады АПК запусціў праграму “Кадравы рэзерв для Новай Беларусі”. Адзін з заснавальнікаў праекта Юрый Губарэвіч казаў, што ў “Кадравым рэзерве” бярэ ўдзел 650 чалавек, але іх гендарная прыналежнасць невядомая. Пра важнасць стварэння кадравага рэзерву жанчын-палітыкаў у сваім аналітычным тэксце піша і даследчыца Леся Руднік.

На аснове акрэсленай праблемы і нашай аргументацыі мы заклікаем АПК і Офіс Святланы Ціханоўскай актыўна далучыцца да працы дзеля падвышэння ўдзелу беларускіх жанчын у палітыцы. Мы абралі менавіта гэтыя структуры, бо:

- сёння публічна прасоўваць гендарную роўнасць, спадзеючыся на рэальны эфект, а не на далейшую маргіналізацыю тэмы, можна толькі ў беларускай палітыцы замежжа;
- АПК і Офіс Ціханоўскай валодаюць дастатковым адміністрацыйным рэсурсам для арганізацыі маштабных доўгатэрміновых адукацыйных праграм;
- у структурах ёсць кантакты і прызнанне на міжнароднай арэне, што дазваляе камунікаваць і ствараць партнёрствы з інстытутамі як асобных дзяржаваў, так і на ўзроўні ЕС;
- у Офіса ёсць прыклады наладжвання падобнай падтрымкі: праграма EU4Belarus SALT, што падтрымлівае рэпрэсаваных студэнтаў і студэнтак (рэалізуецца ў партнёрстве з урадамі Польшчы, Літвы, Чэхіі і Латвіі ды фінансуецца ЕС);
- Народнае антыкрызіснае ўпраўленне ўжо праводзіць праграму “Кадравы рэзерв”, якая можа служыць часткай стартавай інфраструктуры для рэалізацыі нашых рэкамендацый;
- у структурах ёсць кантакты лакальных актараў (НДА, дыяспар і асобных актывістаў і актывістак), якія могуць дапамагчы ў рэалізацыі, распаўсюджванні і зборы інфармацыі на месцах.

**Рэкамендацыі да Валера Кавалеўскага, прадстаўніка Аб’яднанага пераходнага кабінета па міжнародных справах:**

- адвакатаваць у міжнародных арганізацыях (ААН, Рада Еўропы), органах ЕС (Еўракамісія) і перад прадстаўнікамі асобных краін арганізаванне стажыровак і адукацыйных праграм для беларускіх жанчын на тэмы лідарства, мясцовага кіравання, публічнай палітыкі і інш. Падобныя праграмы можна арганізоўваць пры ўніверсітэтах, як, напрыклад, робяць ва Універсітэце Мельбурна. У нашым выпадку такімі інстытутамі могуць стаць ЕГУ і Вольны беларускі ўніверсітэт. Выпускніцы праграм павінны мець магчымасць прайсці стажыроўку ў дзяржаўных інстытутах, НДА, якія ўдзельнічаюць у палітыцы, аналітычных цэнтрах у краінах ЕС.

**Рэкамендацыі для Маргарыты Ворыхавай, дарадцы Офіса Святланы Ціханоўскай у справах моладзевай палітыкі і студэнцтва:**

- выкарыстаць адміністрацыйныя рэсурсы і палітычны капітал Офіса СЦ у пошуку фінансаў для згаданых адукацыйных праграм, скіраваных да жанчын, зацікаўленых ва ўдзеле ў палітычным жыцці. Гэта могуць быць стыпендыі для вучобы, гранты для стажыровак, ментарская падтрымка паводле ўзору EU4Belarus SALT, але гэтыя інструменты мусяць быць скіраваныя непасрэдна да жанчын.

**Рэкамендацыі для Паўла Латушкі, прадстаўніка АПК па транзіце ўлады і яго намесніка Юрыя Губарэвіча, адказнага за праграму “Кадравы рэзерв для Новай Беларусі”:**

- сумесна з фемгрупай, аналітычнымі цэнтрамі і экспертнай супольнасцю распрацаваць праграму ў межах “Кадравага рэзерву”, скіраваную на навучанне жанчын у сферы публічнай палітыкі. Гэта могуць быць анлайн-курсы у вольным доступе, афлайн-трэнінгі на некалькі дзён ці праграмы, якія доўжацца некалькі месяцаў у змешаным фармаце (падобная ініцыятыва існуе, напрыклад, у Польшчы);

- стварыць і распаўсюдзіць у рэдакцыях СМІ і профільных арганізацыях спіс жанчын-экспертак у розных сферах, у тым ліку выпускніц згаданых адукацыйных праграм. Спіс мог бы выкарыстоўвацца для пашырэння прысутнасці жанчын у інфармацыйнай прасторы (прыклад – ініцыятыва Globsec).

**Рэкамендацыі для Яўгенія Андрэйчыка, кансультанта Офіса СЦ па інфармацыйнай палітыцы:**

- сфармуляваць персаналізаваныя мэсіджы для розных груп дэмакратычна настроеных беларусаў і беларусак: Для жанчын – пра тое, што ў палітыку можна і трэба ісці; для мужчын – пра тое, што ад гендарнай роўнасці выгады, у тым ліку эканамічныя, атрымаюць усе групы;

- ініцыяваць інфармацыйныя кампаніі, якія прасоўвалі б ідэі гендарнай роўнасці, інклюзіўнасці, выкарыстання гендарна чуллівай лексікі, а таксама прапанаваныя адукацыйныя магчымасці для жанчын у палітыцы.

# АЎТАРЫ І АЎТАРКІ:



**Вера Моніна** – культуролаг, кам’юніці-менеджар ЦНІ.



**Вікторыя Смаляк** – студэнтка, мэнэджарка.



**Аляксей Пятрэнка** – грамадзянскі актывіст, студэнт бакалаўрскай праграмы па паліталогіі Універсітэта Бухарэста.

**Кейс-клуб** – гэта каманднае спаборніцтва маладых лідараў і лідарак за лепшы праект па вырашэнні сацыяльнага ці палітычнага выкліку.

ЦЭНТР НОВЫХ ІДЭЙ

**Цэнтр новых ідэй** – аналітычны цэнтр, дзейнасць якога прысвечаная магчымасцям развіцця і адказам на выклікі, якія стаяць перад Беларуссю ў XXI стагоддзі. Нашая місія ў тым, каб дапамагчы палітычным і грамадскім арганізацыям пабудаваць больш адкрытую, заможную і ўстойлівую Беларусь.

www.newideas.center

Фота: tsikhanouskaya.org